УДК 811.161.3 (075.3)

# ВОДГУК НА МАСТАЦКІ ТВОР Ў СІСТЭМЕ РАЗВІЦЦЯ КАМУНІКАТЫЎНЫХ УМЕННЯЎ ВУЧНЯЎ: АД КАНЦЭПЦЫІ АЎТАРА ДА РАЗВАЖАННЯЎ ЧЫТАЧА

*Мартынкевіч Святлана Васільеўна*

***Анатацыя.*** *У артыкуле раскрываецца методыка напісання водгуку ў сістэме развіцця камунікатыўных уменняў вучняў. Падаюцца практычныя парады арганізацыі водгуку як другаснага тэксту. Разглядаюцца этапы стварэння выказвання з улікам яго будовы.*

***Ключавыя словы:*** *водгук, творчая праца, камунікатыўныя ўменні, жанр, мастацкі твор, моўны аналіз.*

***Abstract.*** *The article reveals the methodology of writing a review in the system of developing students' communication skills. Practical tips for organizing a review as a secondary text are provided. The stages of creating an utterance are considered, taking into account its structure.*

***Keywords:*** *review, creative work, communication skills, genre, artwork, language analysis.*

Сачыненне – адзін з відаў творчай дзейнасці вучняў, выклад уласных думак на пэўную тэму. Мэта сачынення – фарміраваць камунікатыўныя ўменні, развіваць лагічнае, абстрактнае мысленне, раскрываць эстэтычныя здольнасці, а разам з тым пашыраць фактычныя веды навучэнцаў [4]. Напісанне сачыненняў розных жанраў адбываецца на працягу ўсяго працэсу навучання мове і літаратуры, пры тым першымі ўражаннямі пра кнігу вучні дзеляцца ўжо на пачатковым этапе: выказваюць свае думкі, разважаюць пра ўчынкі герояў, расказваюць, што спадабалася ці не спадабалася ў паводзінах і характарах герояў. Адным з кірункаў сучаснай метадычнай навукі з'яўляецца "развіццё звязнага маўлення вучняў, навучанне іх усім відам маўленчай дзейнасці, фарміраванне ўменняў успрымаць выказванні іншых людзей і ствараць уласныя звязныя выказванні ў адпаведнасці з іх мэтай, зместам, умовамі зносін" [3, с. 299]. Менавіта сачыненне як творчая праца з'яўляецца і формай праверкі сфарміраванасці камунікатыўных уменняў вучняў.

Класіфікацыя творчых прац багатая і разнастайная. Акрамя традыцыйнага падзелу сачыненняў паводле тыпу тэксту, існуе класіфікацыя сачыненняў паводле жанру маўлення. Жанравыя асаблівасці творчых прац вызначаюцца не толькі тэмай і характарам матэрыялу, неабходнага для яе раскрыцця, але і спосабамі выкладу зместу. Асновай для жанравага падзелу творчых прац і распрацоўкі методыкі іх напісання з'яўлюцца *прадмет* адлюстравання, *спосаб* адлюстравання (метады, прыёмы), *мэтавая* накіраванасць тэксту. Традыцыйныя сачыненні могуць быць напісаны ў форме *апавядання, рэпартажа, нататкі, успамінаў падарожнага, нататкі вандроўніка, публіцыстычнай нататкі, дзённікавых запісаў* і інш. Напрыклад, сачыненне на літаратурную тэму – раскрыццё вобраза галоўнага героя, якое звычайна мае шаблонны характар, можна напісаць не толькі ў жанры *сачынення-характарыстыкі, але і лірычнай споведзі, літаратурнага партрэта, нарыса, аналітычнага (крытычнага) разважання, літаратурна-крытычнай нататкі* і інш. Валоданне вучнямі ўменнямі аналізаваць факты стварае аснову сачынення пэўнага жанру, а таксама эмацыйны настрой, які пакідае сачыненне пасля яго прачытання.

Напісанне водгуку як другаснага тэксту ўключана ў праграму вучэбнага прадмета "Беларуская мова" у VIII класе ў сістэме працы па развіцці маўлення: сачыненне-разважанне на аснове прыказкі; *водгук на празаічны або вершаваны твор*; сачыненне на маральна-этычную тэму; сачыненне-разважанне або сачыненне-апісанне па карціне; сачыненне-апісанне помніка гісторыі. Па тыпе маўлення водгук адпавядае тэксту-разважанню, з асаблівасцямі якога вучні ўжо знаёмыя. На ўроках літаратуры водгук на прачытаны твор вучні ствараюць, пачынаючы ад элементарных выказванняў пра свае ўражанні ад твора, да напісання творчай працы-водгуку на мастацкі твор.

Водгук – гэта разгорнутае выказванне эмацыйнаацэначнага характару, сачыненне, якое змяшчае асабістае меркаванне аўтара, аргументацыю гэтага меркавання і ацэнку твору. Сістэма аргументаў заснавана на асабістым чытацкім вопыце аўтара сачынення. Асноўныя рысы сачынення-водгуку – суб'ектыўнасць, эмацыйнасць, ацэначнасць. Асаблівая ўвага звяртаецца на тое, што гэта павінна быць менавіта ацэнка твора, а не пераказ зместу. Пры чым, асабістая аргументацыя той ці іншай ацэнкі абавязковая. Аўтар водгуку тлумачыць, што ў творы выклікала цікавасць, разам з тым раскрывае грамадскую значнасць узнятых праблем. Аргументацыя будуецца на тэзе і яе доказе. Тэза – палажэнне, правільнасць якога павінна быць раскрыта і абгрунтавана; тэзіс, які падаецца як сціслая ацэнка прачытанага.

Спосабы разгортвання і арганізацыі ўласных думак пры напісанні водгуку можа адрозніваецца паводле мэты:

– уласна водгук (ярка выяўляецца эмацыйнасць уражанняў);

– водгук-споведзь (прачытанае становіцца падставай расказаць пра сябе);

– водгук-пытанне (аўтар разважае над асноўным пытаннем у творы);

– водгук-рэфлексія (усведамленне самога сябе ў кантэксце прачытанага тэксту);

– водгук-рэкамендацыя (аўтар тлумачыць, чаму ён спрабуе зацікавіць творам іншых;

– водгук-дэталь (увага аўтара прыцягваецца да якой-небудзь мастацкай дэталі, якая дапамагае яму

зразумець жыццё, адносіны людзей і інш.);

— водгук-асацыяцыя (прачытанае натхняе на ўласную творчасць);

— водгук-успамін (перадаюцца ўражанні ад твора на працягу ўласных пражытых гадоў).

Падрыхтоўка да напісання водгуку падпарадкуецца пэўнаму алгарытму, на кожным этапе якога настаўнік прапануе прыёмы, улічваючы ступень навучання і мэту вучэбнай дзейнасці [1].

Творчая праца пачынаецца са знаёмства з творам, яго ўважлівага прачытання. Вельмі важна на пачатковым этапе асэнсаваць, спадабаўся твор ці не, якія праблемы ўзняты аўтарам, што ляжыць у яго аснове ці якім падзеям ён прысвечаны, у чым актуальнасць для сённяшняга дня. Для таго, каб потым вярнуцца да пачатковых думак, першыя ўражанні варта занатаваць.

Далейшы важны крок у разуменні твора — вызначэнне тэмы і ідэі, раскрыццю якіх і падпарадкаваны ўсе выкарыстаныя вобразныя сродкі. Тэма — пра што твор або чаму ён прысвечаны. Ідэя — асноўная думка, тое, што сцвярджаецца ў творы. Асэнсаванне тэмы і ідэі знойдуць выражэнне пры напісанні заключэння.

Наступны этап працы — уважлівае прачытанне твора па частках з вызначэннем мікратэм і абдумваннем сваіх уражанняў ад кожнай часткі. Важна адзначыць асаблівасці кампазіцыі, будовы кожнай часткі і сказаў, з якіх складаецца тэкст, танальнасць твора. Адметнасць структуры твора паказваецца праз указанне колькасці частак, іх характарыстыкі, разважанняў пра тое, што гэта дае твору. Танальнасць твора можа быць аптымістычнай або сумнай, песімістычнай.

Стварэнне водгуку пачынаецца з уступу, у якім расказваецца пра абставіны знаёмства з творам, гістарычную аснову твора, пратэтыпаў герояў, калі такія ёсць. Можна ўключыць звесткі пра аўтара як асобу, яго творы, творчую манеру, вызначыць, чым прыцягвае творчасць. Пачаткам водгуку могуць стаць радкі твора, першыя або тыя, што найбольш уразілі, асацыяцыі, пачуцці, думкі-разважанні, выкліканыя творам.

Прапануем некаторыя прыёмы ўступу:

1) лірычны роздум аўтара сачынення, які ўводзіць у далейшыя разважанні на аснове твора;

2) рытарычныя пытанні, сугучныя тэме;

3) дыялог з уяўным героем па тэме (праблеме) твора, што патрабуе ралейшых разважанняў;

4) назыўныя сказы як асацыяцыі па праблематыцы твора;

5) цытата, якая дапамагае асэнсаваць праблему (тэму) твора;

6) ключавое слова мастацкага тэксту.

Асноўную частку водгуку варта пачаць з разгляду ўзаемасувязей паміж тэмай, ідэяй, назвай твора.




Важна ўбачыць і перадаць аўтарскую пазіцыю, якая можа быць адлюстравана ў абмалёўцы герояў, тоне аповеду або лірычнай споведзі, зададзеным аўтарам.

Пазіцыя аўтара — гэта яго стаўленне да праблемы, заяўленай у творы. Таму важна памятаць, што яна часцей за ўсё выяўляецца прама, непасрэдна, але можа выяўляцца і праз падтэкст. Непасрэднае выражэнне аўтарскай пазіцыі — у назве твора, асобных ключавых сказах тэксту, аргументах. Выражэнне аўтарскай пазіцыі праз мадальны палан тэксту — гэта рытарычныя пытанні, парадак слоў у сказах, лексічныя паўторы, мадальныя словы і часціцы *(безумоўна, бясспрэчна, відавочна, мабыць, напэўна, сапраўды і інш.)* Мастацкае майстэрства аўтара выяўляе асаблівасці яго творчай манеры і мастацкага густу.

Моўны аналіз тэксту — гэта падрабязнае і выразнае апісанне аўтарскай пазіцыі. Мэта моўнага аналізу — унікнуць у змест, даць ацэнку спосабу ўздзеяння на чытача, зразумець адносіны аўтара да праблемы, узнятай у творы. Пранікненне ў моўную тканіну твора накіравана на вызначэнне ролі вобразных сродкаў — тропаў ці стылістычных фігур, кантэксутальнага значэння слоў. Удумванне ў сэнс сказаў вядзе да разумення мэтазгоднасці ўжывання кожнай моўнай адзінкі з пазіцыі яе мастацкай вартасці ў творы. Таму перш за ўсё варта разгледзець прыёмы стварэння вобразнасці, мастацкія дэталі, у цэлым — асаблівасці мовы аўтара. Вобразна-выяўленчыя сродкі — тропы і стылістычныя фігуры — спрыяюць пранікненню ў аўтарскую лабараторыю.

Тропы — гэта моўныя сродкі, якія ў творы набываюць пераносны сэнс. Яны ўзбагачаюць твор, надаюць яму асаблівую выразнасць. Пры дапамозе тропаў вылучаюцца характэрныя прыметы прадметаў і з'яў, перадаюцца адносіны аўтара да таго, пра што ён піша. Да найбольш ужывальных тропаў адносяцца эпітэты, параўнанні, метафара, перыфраза, гіпербала, літота, іронія. Стылістычныя фігуры — вобразна-выяўленчыя сродкі, утвораныя сінтаксічна. Да іх адносяцца:

— інверсія — размяшчэнне членаў сказа ў адваротным, непрамым парадку з мэтай узмацніць выказванне; уласціва галоўным членам сказа, дапасаваным азначэнням, дапаўненням, акалічнасцям: *Рэчка мутная. Мільганулі дзе-тры плоткі. Каля берага мармычуць жабы, збіраючыся нераставаць. З* **абалоння** *ў раку булькоча ручаёк* (Я.Брыль);

— антытэза — кантраснае супастаўленне супрацьлеглых паняццяў, думак, вобразаў, якое служыць для ўзмацнення выразнасці мовы: *Ад роднах* ***ніў****, ад роднай хаты,* ***у*** *панскі двор дзеля красы яны, бяздольныя, узяты ткаць залатыя паясы* (М.Багдановіч);

— анафара — паўтарэнне аднолькавых слоў, выразаў, гукаў у пачатку сказа: ***У*** *цёмным небе — хараводы сіняватых зорак, у цёмным небе свеціць месяц залатым сярпом* (М.Багдановіч);

— паралелізм — аднолькавая сінтаксічная пабудова суседніх сказаў або ўрыўкаў: *Над ракою ў спакою зацвітала каліна; у сяле за ракою вырастала дзяўчына* (Я.Купала);

— эпіфара — паўтарэнне аднолькавых слоў, выразаў, гукаў у канцы сказа;

— умаўчанне — абрыў фразы, які звычайна абазначаецца шматкроп'ем і ўказвае на незакончанасць або перапынак у выказванні, выкліканы хваляваннем гаворачага або нечаканай неабходнасцю пераходу да іншай тэмы [2].

Трэба не проста пералічыць тропы ці прывесці прыклады, а “расчытаць” іх сэнс, выявіць ролю кожнага слова. Задача настаўніка — сістэмна “вучыць разумець, што той ці іншы прыём, элемент мастацкай структуры твора з'яўляецца спосабам стварэння вобраза” [6, с. 57].

Важным для напісання водгуку з'яўляецца вызначэнне цэнтральнага вобраза і адносін аўтара да яго. Перш за ўсё чытач указвае, колькі разоў аўтар прыцягвае ўвагу да цэнтральнага вобраза, якія сінонімы (перыфразы) яго замяняюць на працягу тэксту, якія эпітэты-характарыстыкі спалучаюцца, што можа проціпастаўляецца яму ў творы.

Праблема — гэта складаная жыццёвая сітуацыя, якую аўтар разглядае ў цэнтры свайго твора, галоўнае пытанне, на якое імкнецца знайсці адказ. Увесь мастацкі тэкст — вырашэнне праблемных пытанняў: *пра што? навошта? з якой мэтай? чаму? якім чынам?* Спосабы адказу на іх залежаць ад аўтарскай пазіцыі ў тэксце. Адносіны аўтара да ўзнятай праблемы могуць выражацца праз ужыванне  слоў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі, адмоўнай ці станоўчай канатацыяй; прыметнікамі-эпітэтамі, параўнаннямі. Гэта і ёсць вырашэнне праблемных пытанняў.

Праблемы, якія разглядаюцца ў мастацкіх і публіцыстычных творах, бываюць маральныя, экалагічныя, сацыяльныя, псіхалагічныя, філасофскія. Таму вырашэнне праблемы ў водгуку знаходзіць сваю інтэрпрэтацыю ў аўтара сачынення, які можа ўказаць, што праблема агульназначная, злабадзённая, актуальная, набалелая, складаная і інш. Варта памятаць, што водгук — гэта другасны твор, таму раскрыць праблему – значыць растлумачыць, у чым яе важнасць, чаму менавіта гэту праблему ставіць  аўтар у цэнтр увагі.

У водгуку дарэчным будзе выкарыстанне наступных канструкцый:

*—Аўтар уздымае (закранае, фармулюе, вырашае) цікавую (складаную, сур'ёзную, невырашальную, надзённую, вострую) праблему ...*

*— У вершы (тэксце) раскрываецца (аналізуецца, даследуецца) праблема (тэма) ...*

*— Самымі пераканаўчымі довадамі з'яўляюцца ...*

*— Аўтар даследуе ..., на аснове гэтага робіць выснову пра ...*

*— Свае развагі ... пачынае з таго, што ..*

*— Каб мы зразумелі, як гэта важна, аўтар распавядае пра тое, што ...*

*— Аўтару не ўсе здаецца так проста. Спрабуючы разабрацца ў гэтым пытанні, ён адзначае ...*

*— ...! Колькі напісана (гаварылася) пра гэта. Але гэтай тэме (праблеме) аўтар надае новае гучанне.*

*— Чаму ...? (Для чаго ...? У чым сэнс ...?) - Гэтыя пытанні ставіць аўтар у сваім тэксце (вершы, апавяданні).*

Пры гэтым перш за ўсё аўтар сачынення выказвае думкі і пачуцці, якія знайшлі водгук у душы, апісвае факты, якія найбольш уразілі. Шчырасць, непасрэднасць, пранікнёнасць — галоўныя характарыстыкі сачынення-водгуку, якія з'яўляюцца найбольш складанымі для перадачы менавіта ў пісьмовай форме. Таму падтрымкай у працэсе стварэння ўласнага тэксту-водгуку могуць стаць словы А.М. Талстога: “Не бывае ніколі ні ў кога, каб было лёгка пісаць, каб лілося з-пад пяра ... Пісаць заўсёды цяжка, і чым цяжэй, тым лепш выходзіць” [5].

Такім чынам, вызначыўшы праблему, неабходна дакладна сфармуляваць сваё стаўленне да яе і прадумаць аргументацыю ўласнай пазіцыі. Можна згаджацца ці не згаджацца з аўтарам, але абавязкова трэба абгрунтаваць сваю думку, прывесці доказы (не менш за два). Тыпы аргументацыі ўласнай пазіцыі могуць грунтавацца на жыццёвым або чытацкім (літаратурным) вопыце. Прыведзеныя рэальныя факты з жыцця, уласныя назіранні і вывады, традыцыйна-гістарычны вопыт абгрунтоўваюць тэзіс. У водгуку важна прадэманстраваць багаты вопыт чытача. Варта прыводзіць прыклады з твораў іншых аўтараў, праводзіць паралелі паміж літаратурнымі вобразамі. Аднак пры гэтым імкнуцца пазбягаць неадпаведнасці, калі відавочна разрозненая,  надуманая факталагічная аснова прыведзеных (“прыцягнутых”) прыкладаў.

Пры вызначэнні ўласнага меркавання можна выкарыстоўваць канструкцыі:

*— Я з цікавасцю прачытаў (-ла) ...*

*— Я пераканаы(а) (часта думаў, атрымаў сапраўднае задавальненне, са здзіўленнем зразумеў, шчыра зацікавіўся, згодны) ...*

*— Можна пагадзіцца з аўтарам у тым, што ...*

*— Мне падалося цікавым (актуальным, значным) ...*

*— На маю думку...*

*— Пытанні, што ўздымаюцца аўтарам, вельмі актуальныя, бо ...*

*— Хацелася б адзначыць ...*

*— Нельга застацца абыякавым, таму што...*

*— Мяне асабліва ўсхвалявала тое, што ...*

*— Я падзяляю пункт гледжання аўтара, але ...*

*— Тэкст аказаў на мяне неадназначнае ўражанне: з аднаго боку ..., але з іншага ...*

*— На першы погляд, тэма (праблема) здаецца звыклай (смешнай, дакучлівай, банальной, нязначнай), але...*

Паняцце цэласнасці мастацкага твора выражаецца праз адзінства формы і зместу: мастацкага выражэння элементаў зместу — тэмы, ідэі, праблемы, мастацкіх вобразаў, канфлікту і змястоўнасці элементаў формы — жанру, кампазіцыі, сюжэту, вобразна-выяўленчых сродкаў і інш. Разгляд кампазіцыі заключаецца ў вызначэнні сюжэтных (экспазіцыі, завязкі, кульмінацыі, развязкі) і пазасюжэтных (аўтарскіх адступленняў) элементаў.

Заключэнне водгуку — гэта ўласныя высновы, падвядзенне вынікаў развважанняў. Мэта заключэння — пакінуць добрае ўражанне пра водгук як творчую працу. Таму асноўнае патрабаванне — лагічнае завяршэнне развaг, вырашэнне праблемы, узнятай аўтарам у мастацкім творы. У заключэнні могуць змяшчацца

дапаўненні да думкі аўтара твора або этычна карэктнае пярэчанне. Аднак абавязкова завершыць думку, выказаную ва ўступе творчай працы. Такім чынам, заключэнне можа быць напісана ў адной з такіх формаў, як: 1 — агляд палажэнняў і доказаў, выкладзеных у асноўнай частцы; 2 — карэктная памлеміка з аўтарам мастацкага тэксту; 3 — абгрунтаваная цытата як выніковае меркаванне; 4 — яркі прыклад-ілюстрацыя, што пацвярджае выказаную думку; 5 — выразнае параўнанне як вынік разважанняў; 6 — лаканічнае разважанне-заключэнне.

Моўнае афармленне водгуку падпарадкавана патрабаванням адпаведнасці сэнсавай цэласнасці, звязнасці і паслядоўнасці выкладу, дакладнасці і выразнасці маўлення. Важным этапам з'яўляецца рэдагаванне водгуку — праверка і выпраўленне памылак. Адпаведнасць жанру, структурнай і стылістычнай арганізацыі, патрабаванням пісьменнасці — аснова для вызначэння крытэрыяў ацэньвання водгуку.

Такім чынам, разуменне твора, спасціжэнне сутнасці аўтарскай задумы, аналіз вобразна-выяўленчых сродкаў і інтэрпрэтацыя зместу з'яўляюцца галоўнымі элементамі стварэння ўласнага другаснага тэксту на аснове мастацкага твора. Навучанне водгуку ў сістэме працы па развіцці камунікатыўных уменяў вучняў уяўляе сабой працяглы і складаны працэс, аднак вельмі важны з пазіцыі сучасных патрабаванняў да асобасных адукацыйных вынікаў, функцыянальнасці зместу навучання.

## Спіс літаратуры


1. Доўгаль, Дз. Вучымся пісаць водгук. Спроба алгарытмізацыі творчага працэсу / Дз. Доўгаль // Роднае слова. — 2008. — №11. — С. 88–93.
2. Лазарук, М.А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М.А. Лазарук, Е.Я. Ленсу. — Мінск : Нар. асвета, 1996. — 176 с.
3. Литвинко, Ф.М. Методика преподавания русского языка в школе: учеб. пособие / Ф.М. Литвинко. — Минск: Вышэйшая школа, 2015. — 448 с.
4. Мартынкевіч, С.В. Сачыненне як творчая праца: ад тэорыі да практыкі / С. В. Мартынкевіч // Роднае слова. — 2023. — №8. — С. 57–60.
5. Толстой, А.Н. К молодым писателям / А.Н. Толстой // Журнал «Литературная учёба», 1939, №2. — URL: https://author.today/post/460348#:~:text (дата обращения: 02.05.2025).
6. Шевцова, Л.И. Подготовка учащихся к олимпиаде по учебному предмету «Русский язык и литература»: написание отзыва о лирическом произведении / Л.И. Шевцова // Вестник ВОИРО. Спецвыпуск. — 2024. — С. 55–59.


*Дата поступления в редакцию: 27.05.2025*

УДК 82-4

# ЭССЕ КАК АКТУАЛЬНЫЙ ЖАНР СОВРЕМЕННОСТИ: ФУНКЦИОНАЛЬНОСТЬ, ЖАНРОВЫЕ ПРИЗНАКИ

*Шевцова Людмила Ивановна*

***Аннотация.*** *В статье обосновывается актуальность жанра эссе в различных сферах социальной жизни и в процессе становления личности, определяются жанровые признаки публицистического эссе: монотемность, субъективность, парадоксальность, экспрессивность, диалогичность, свобода композиции, актуальность, оригинальность, самобытность.*

***Ключевые слова:*** *эссе как жанр публицистики, цель эссе, жанровые признаки эссе.*

***Abstract.*** *The article substantiates the relevance of the essay in various spheres of social life and in the process of personality development, the genre features of the journalistic essay are defined: monothematic, subjective, paradoxical, expressive, dialogical, freedom of composition, relevance, originality, distinctiveness.*

***Keywords:*** *essay as a genre of journalism, purpose of the essay, genre features of the essay.*

В реалиях современности все более актуализируется необходимость человека размышлять о сущностях и явлениях жизни, о человеке в ней, о ценностях, о смыслах того, с чем он сталкивается в повседневности, когда соприкасается с историческим прошлым своей страны и человечества в целом, научными достижениями, художественными произведениями — литературными, живописными, кинематографическими, музыкальными и другими.

Необходимость в подобных высказываниях продиктована запросом на них социума: в частности, в последнее время востребованным оказался жанр эссе как обязательное условие различных конкурсов, проводимых общественными организациями, учреждениями образования, социальными проектами и др. И здесь человек, которому необходимо сочинять в заданном жанре, сталкивается с незнанием его законов и полным отсутствием опыта написания.

Этот опыт человек мог обрести в процессе обучения в школе (гимназии, лицее) и на последующих ступенях образования — в колледже, университете. Это возраст юности, когда рождается *потребность* в подобного рода высказываниях. Опыт интимных дневников — свидетельство реализации этой потребности,